Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

8 ЧЭРВЕНЯ 2024 г. СУБОТА

№ 111 (30245)

ЗВЯЗДА

НЕ БІЗНЕС, А САЦЫЯЛЬНАЯ АДКАЗНАСЦЬ 2

ПРЫПРАВА З ЭНДАРФІНАМ 8

СВЯТА МАЙСТРОЎ СЛОВА

Грамадскаму аб'яднанню «Саюз пісьменнікаў Беларусі»

Паважаныя сябры!

Стварэнне ў чэрвені далёкага 1934 года Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР заклала трывалы падмурак дзяржаўных стасункаў з аўтарамі мастацкай і нацыянальнай літаратуры, вызначыла яе галоўную задачу — служэнне роднай Айчыне, беларускаму народу.

Сярод пачынальнікаў той працы былі яркія майстры слова — Якуб Колас, Янка Купала, Міхась Чарот, Кузьма Чорны, Зміцрок Бядуля, Міхась Клімковіч, Пятрусь Броўка, Кандрат Крапіва, Міхась Лынькоў і іншыя. Жыццё пацвердзіла каштоўнасць адзінства літаратурных сіл, дзяржавы і грамадства, аўтарытэтнае месца гэтага віду мастацтва ў агульнай прасторы культуры.

Многія творы, народжаныя ў 1930-я і пазнейшыя дзесяцігоддзі, і зараз з'яўляюцца прадметам увагі чытачоў. Перыяд Вялікай Айчыннай вайны адбіўся ў работах пісьменнікаў, якія самі гераічна абаранялі Радзіму. На сцяне рэйхстага пакінулі свае аўтографы паэты Пятро Прыходзька і Паўлюк Пранузе.

Сёння ў складзе арганізацыі працуюць лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, заслужаныя дзеячы культуры, народны пісьменнік Мікалай Чаргінец. Упэўнены, вы і надалей будзеце аб'ектыўна адлюстроўваць сучасныя падзеі і сацыяльныя з'явы.

Творчага ўсім плёну, новых кніг і дасягненняў!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Мама і яе героі

Днямі мэр Мінска Уладзімір Кухараў ва ўрачыстай абстаноўцы ўручаў жыхаркам сталіцы ордэн Маці. Сярод узнагароджаных — Алена КАЛЯСНІКАВА, шчаслівая мама пяці сыноў. Алена Сяргееўна — настаўніца-пастаноўшчык Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі. Разам з мужам Аляксеем, які працуе дызайнерам у вышывальнай майстэрні Свята-Елісавецінскага манастыра, яна распісвала сцены ў адміністрацыйных будынках Дома міласэрнасці ў Мінску. У іх сыноў Канстанціна, Мікалая, Аляксандра, Івана і Серафіма ёсць добры прыклад творчасці і веры.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Юрый ЧАБАТАР, міністр эканомікі:

«Пры рэалізацыі канцэпцыі рэгіянальнага развіцця нашай краіны былі вызначаны адпаведныя кірункі развіцця з улікам спецыфікі і патэнцыялу кожнага рэгіёна. Адным з ключавых прыярытэтаў развіцця эканомікі Беларусі з'яўляецца рэалізацыя інавацыйных і высокатэхналагічных праектаў. Прыкладам такога флагманскага праекта з'яўляецца індустрыяльны парк «Вялікі камень». Інвестараў сёння цікавяць не столькі прэферэнцыі, колькі гатовая інфраструктура для хуткага запуску праектаў. Сёння ў гарадах будуюцца індустрыяльныя паркі. Беларусь знаходзіцца ў пастаянным пошуку новых фарматаў, якія дадуць магчымасць дынамічна рухацца на шляху да ўстойлівасці».

Блізкая ўлада

ДАПАМОГА І ЎВАГА — КОЖНАМУ

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла асабісты прыём грамадзян у Полацку

Фота БелТА

Як заўсёды, людзі ішлі да Наталлі Качанавай з тым, што хвалюе, і са спадзяваннем, што пытанне вырашыцца станоўча.

Першым да Старшыні звярнуўся жыхар Полацка з пытаннямі недастатковага добраўпарадкавання камунальнымі службамі аднаго з мікрараёнаў горада. Яшчэ заяўнік адзначыў, што ў мікрараёне 3-я Баравуха, дзе ён пражывае, грамадскі транспарт ходзіць з перабоямі, у некаторых аўтобусаў максімальны інтэрвал чакання каля гадзіны. Мужчына таксама падкрэсліў, што некаторыя маршруты заканчваюць работу рана, нібыта пасля шасці гадзін вечара жыццё ў мікрараёне замірае, і раніцой рэйсы з перабоямі дастаўляюць нязручнасці, бо заяўнік дабіраецца на работу ў Наваполацк а сёмай гадзіне раніцы.

Наталля Іванаўна адзначыла, што гэта пытанне абмяркоўвалася на нарадзе ў Прэзідэнта, тады была пастаўлена задача разабрацца з транспартам у гарадах. «Ва ўсіх рэгіёнах людзі звяртаюцца з падобнай праблемай. Аператар, які складае расклад, знаходзіцца ў Віцебску і не можа адсачыць рэальную карціну пасажырапатоку тут. Я разумею, што ёсць маршруткі, таксі, але аўтобусы таксама павінны хадзіць па раскладзе. У гэтых жа мікрараёнах пражывае шмат людзей, асфальт новы паклалі, ну дадайце яшчэ рэйсаў, каб людзі не чакалі на прыпынку па гадзіне. Праблем з транспартам у гарадах і раёнах быць не павінна», — сказала Качанава і даручыла Міністэрству транспарту і камунікацый, а таксама Віцебскаму аблвыканкаму дапамагчы Полацкаму аўтобусному парку ў абнаўленні транспарту.

Трое заяўнікаў з васьміквартэрнага дома па вуліцы Чырвонаармейскай звярнуліся з праблемай ацяплення, у прыватнасці пераводу дома на электраацяпленне. Пытанне ў тым, што адказныя службы да 2019 года паставілі электракатлы толькі ў чатырох кватэрах, астатнія не ўвайшлі ў план, дый на астатнія катлы не хапае магутнасцяў старой лініі электрапередачы. Атрымліваецца, што дом у цэнтры Полацка дагэтуль напалову ацяпляецца печамі. Кіраўніцтва мясцовай ЖКГ пацвердзіла, што неабходна замяніць лінію і падстанцыю, адзначыла і тое, што дом уключаны ў план па правядзенні электраацяплення аж на 2030 год. Такая няблізкая перспектыва заяўнікі не радуе, некаторыя сумна жартуюць, што могуць увогуле не дажыць да доўгачаканай падзеі.

«Не хачу чуць аб такіх тэрмінах. Даю даручэнне ўключыць дом у план на 2025 год абавязкова. Паглядзець, колькі фінансавых сродкаў трэба на замену лініі і падстанцыі», — паставіла задачу адказным асобам Наталля Качанава.

Жанчыны падкрэслілі таксама, што і хлявы каля дома, якія выкарыстоўваюцца ў якасці дроўнікаў, знаходзяцца ў непрыдатным стане і хутка могуць разбурыцца ўвогуле. Спецыялісты ЖКГ не ўдзяляюць гэтай праблеме пэўнай увагі, як і своечасовому абкошванню прылеглай тэрыторыі агульнага карыстання.

Старшыня Савета Рэспублікі даручыла начальніку ЖКГ раёна ў сціслыя тэрміны да канца месяца адрамантаваць дроўнікі і абкасіць траву. «Я на свае вочы бачу, што камунальныя службы не спраўляюцца з абкошваннем па гарадзе. Хоць гэта ваш абавязак, за які атрымліваеце грошы. Не паспяваеце своечасова касіць — пасадзіце дрэвы, кусты», — заўважыла Наталля Качанава.

Падчас асабістага прыёму грамадзян былі агучаны пытанні неналежнага ацяплення ў жылых кватэрах, пастаяннага падтаплення дома ў прыватным сектары, міжасобасных канфліктаў паміж суседзямі і іншыя.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

Аб тым, з якімі праблемамі яшчэ звярталіся людзі да Наталлі Качанавай у Полацку, чытайце ў найбліжэйшым нумары «Мясцовага самакіравання».

Падзея

Карнавал па-гродзенску

У Гродне ўчора адбылося адкрыццё XIV Фестывалю нацыянальных культур

Самым яскравым момантам стала шэсце прадстаўнікоў нацыянальных дыяспар, якія пражываюць у Беларусі. Удзельнікі святочнай калоны прайшлі па пешай вуліцы старажытнага Гродна да Савецкай плошчы, дзе позна вечарам адбылося ўрачыстае адкрыццё свята. Прывітальны ліст удзельнікам фестывалю накіраваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Сёлета падзея аб'яднала прадстаўнікоў 36 нацыянальнасцяў. Галоўным лейтматывам стала тэма сям'і. Фестываль-канцэрт Беларусь як адзіную шматнацыянальную сям'ю, дзе ёсць сяброўства, павага, традыцыі, жаданне жыць у міры і згодзе.

У першы фестывальны дзень адбылася сустрэча міністра культуры Беларусі Анатоля Маркевіча з беларусамі замежжа. Па словах міністра, вельмі важна, што такі маштабны фестываль збірае сяброў, землякоў, якія з задавальненнем прыязджаюць на сваю радзіму. Яны могуць убачыць прыгожыя гарады і вёскі, пагутарыць з землякамі.

У гэты ж дзень у Каложскім парку на «Алеі сяброўства» з'явіліся дрэўцы, пасаджаныя ў гонар новых членаў шматнацыянальнай фестывальнай сям'і. Такая традыцыя існуе даволі шмат гадоў. Сёлета дрэвы прысвечаны Аргенціне, Манголіі, Бурацыі, Камеруну і Егіпту. З'явіліся экзоты ад нігерыйцаў і пакістанцаў.

Дыялогавая пляцоўка аб'яднала ў ГрДУ імя Я. Купалы замежных студэнтаў трох ВНУ, якія расказалі аб сваіх краінах і падзяліліся ўражаннямі аб Беларусі.

Важнае месца ў фестывальнай тэматыцы адведзена 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Даце прысвечаны круглы стол, які традыцыйна праходзіць з удзелам прадстаўнікоў усіх нацыянальных таварыстваў Беларусі. Сёлета яго назва — «Адзінства народаў — залог Вялікай Перамогі. Беларусь — наш агульны дом».

Урачыстае адкрыццё свята адбылося з удзелам ганаровых гасцей, прадстаўнікоў замежных дзелегацый, рэспубліканскіх і мясцовых улад. Прагучалі прывітальныя словы, сваё майстэрства прадэманстравалі прафесійныя і аматарскія калектывы і артысты. Завяршыўся першы дзень маладзёжнай дыскатэкай і фееверкам.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Выставы тыдня

АД «ЗЯМЛІ» ДА «ЛІЧБЫ»

Гэты тыдзень адзначыўся двума буйнымі міжнароднымі форумамі: у «Вялікім камені» пачалася выстава «Белагра-2024», а на «Мінск-Арэне» стартаваў «ТІБА-2024». Абедзве выставы ўражваюць размахам, маштабнасцю, колькасцю ўдзельнікаў, наведвальнікаў.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

А паглядзець сапраўды ёсць на што. На «Белагра» шырока прадстаўлены апошнія дасягненні краіны ў галіне сельскагаспадарчых тэхналогій, спецыялізаванага машынабудавання і тэхналагічнага абсталявання. «ТІБА» ў сваю чаргу здзіўляе нават прасунутых спецыялістаў з ІТ-сферы. Такое мноства гаджэтаў, робатаў, разумных інфармацыйных сістэм наўрад ці дзе сустрэнеш!

Рэпартажы нашых карэспандэнтаў прапануюць вам акунуцца ў атмасферу форумаў, пабываць у гушчы падзей і, безумоўна, адчуць гонар за нашу Беларусь. Краіну, якая заўсёды імкнецца да новых вяршынь.

СТАР. 3

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Краіны глабальнага Поўдня адмаўляюцца ад «шкодных заходняй мадэлі»

Краіны глабальнай большасці адмовіліся ад шкоднай для іх неалібералыай мадэлі і будуюць уласныя фінансавыя механізмы ў выгадным супрацоўніцтве з краінамі БРІКС. Такую пазіцыю выклала ТАСС заснавальнік міжнароднага Шылераўскага інстытута Хельга Цэп-Ларуш. «Мы перажываем завяршэнне 600-гадовага перыяду каланіялізму. Глабальная большасць, якая прадстаўляе больш за 80 працэнтаў сусветнага насельніцтва і 70 працэнтаў сусветнага ВУП, рухаецца да пабудовы новай эканамічнай сістэмы, заснаванай на ўзаемавыгадным супрацоўніцтве і пяці прынцыпах мірнага суіснавання», — лічыць эксперт. Гэтыя прынцыпы ўключаюць узаемную павагу тэрытарыяльнай цэласнасці і суверэнітэту, ненападзенне, неўмяшанне ва ўнутраныя справы, роўнасць і ўзаемную выгаду, мірнае суіснаванне. Паводле яе выказвання, краіны сусветнай большасці «працуюць над уласнымі фінансавымі механізмамі, што адкрывае ім доступ да крэдытавання ў мэтах пабудовы развітых у прамысловых адносінах эканомік».

Эксперты ААН заклікалі ўсе краіны прызнаць Палесціну

Эксперты ААН у галіне правоў чалавека лічаць, што ўсе дзяржавы павінны прызнаць Палесціну. Такая пазіцыя выкладзена ў сумесным заяве, апублікаванай у Жэневе. Адзначаецца, што прызнанне Палесціны «з'яўляецца важным пацвярджэннем правоў палесцінскага народа, яго барацьбы і пакут за свабоду і незалежнасць». Усе дзяржавы павінны рушыць услед прыкладу 146 краін, якія ўжо заявілі аб прызнанні Палесціны. Эксперты перакананы, што Палесціна павінна «мець магчымасць карыстацца поўнымі самавызначэннем, у тым ліку магчымасцю існаваць, вызначаць свой лёс і свабодна развівацца як народ, які знаходзіцца ў бяспецы». На іх думку, у гэтым заключаецца «папярэдняя ўмова для трывалага міру ў Палесціне і на ўсім Блізкім Усходзе — пачынаючы з неадкладнай аб'явы спынення агню ў сектары Газа і спынення далейшых ваенных уварванняў у Рафах». Подпісы пад заявай паставілі 25 экспертаў ААН.

У Парыжы падчас Алімпійскіх гульняў чакаецца рэзкі рост злачыннасці

Як лічыць галоўны пракурор французскай сталіцы Лора Бека, тысяч супрацоўнікаў сіл унутранай бяспекі, якія будуць разгорнуты ў Парыжы падчас Алімпійскіх гульняў, можа быць недастаткова, каб спыніць злачыннасць. Аб гэтым паведамілі газета Le Figaro. Паводле меркавання пракурора, сярод чаканых злачынстваў — кібератакі, кішэнныя крадзяжы, а таксама акты гвалту, у тым ліку сексуальнага характару. Лора Бека звязала магчымы рост колькасці правапарушэнняў з вялікім патокам турыстаў і спажываннем алкаголю. У сувязі з такімі прагнозамі пракуратура Парыжа прыняла рашэнне ўмацаваць свой штат. Як вядома, XXXIII летнія Алімпійскія гульні пройдуць у Францыі з 26 ліпеня да 11 жніўня. Бяспеку ў гэты перыяд будуць забяспечваць каля 45 тысяч французскіх паліцэйскіх і жандараў і каля 20 тысяч вайскоўцаў.

КАРОТКА

- **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава сустрэлася з намеснікам старшыні Савета Федэрацыі Юрыем Вараб'ёвым. Сенатары ацанілі ўзровень падрыхтоўкі пляцовак да правядзення Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.**
- З фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы культуры і мастацтва будзе выдзелена Br1,25 млн на рэалізацыю шэрагу культурна значных праектаў.
- **Міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі на 1 чэрвеня 2024 года, паводле папярэдніх звестак, склалі $8,411 млрд у эквіваленце.**

Спажывец

ЭСКІМО ЯК АНТЫСТРЭС,

або Лёгкі спосаб узняць настрой усяго за два рублі

Прыемна, што ў нашым пераменлівым свеце ёсць добрыя рэчы, якія застаюцца нязменнымі. Нават калі гэта простыя радасці накшталт марожанага ў спякоту. Але паміж «смачна» і «карысна» не заўсёды можна паставіць знак роўнасці. На пачатку лета эксперт расказала, як выбраць сапраўды карыснае марожанае.

Права называцца пламбірам

Марожанае — дэсерт унікальны. Здавалася б, тыповы «дафамінавы ўдар», спалучэнне тлушчу і вугляводаў — каротка ўсплёск станоўчых эмоцый і лішнія кілаграмы ў перспектыве. Але не ўсё так адназначна: карысць марожанага сёння пацвярджаюць і медыкі, і дыетолагі. А каб выбрацьякаснае марожанае, спажывец не павінен ненавацца чытаць склад на ўпакоўцы, адзначае **загадчыца сектара стандартызацыі і нарміравання малочнай галіны РУП «Інстытут мяса-малочнай прамысловасці» Алена ВАЙЦЯХОВІЧ.**

— Згодна з дзеючым заканадаўствам Еўразійскага эканамічнага саюза, выцворца абавязаны вынесці на ўпакоўку ўсю інфармацыю аб найменні і складзе прадукту, — тлумачыць спецыяліст.

Існуе некалькі разнавіднасцяў марожанага, яны адрозніваюцца складам, тлустасцю і спосабам вырабу. Так, калі на ўпакоўцы мы бачым словы «пламбір», значыць, марожанае змяшчае не менш за 12 % тлушчу. Тлустасць сметанковага марожанага — у дыяпазоне ад 8 да 11,5 %. Найбольш дыетычны варыянт — малочнае марожанае: яно змяшчае не больш за 7,5 % малочнага тлушчу.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2024 года

Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

ISSN 1990 - 763X

Дзяржаўны інтарэс

Не бізнес, а сацыяльная адказнасць

У Палаце прадстаўнікоў дэпутаты і кіраўніцтва «Белкаапсаюза» абмеркавалі далейшую стратэгію развіцця прадпрыемства

Тое, што сітуацыя там складаная, не сакрэт: у лютым прайшла вялікая нарада з удзелам Прэзідэнта, у красавіку пытанне разглядалася ўрадам. Сустрэча старшыні праўлення «Белкаапсаюза» Інесы Караткевіч, якая ўзначальвае структуру з потага, з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў стала працягам сістэмнай работы па ўдасканаленні дзейнасці шматгаліновага прадпрыемства. Бо прычын для занепакоенасці застаецца, на жаль, нямала: амаль усе галіны прадпрыемства, за выключэннем нарыхтоўкі і вытворчай сферы, стабільнага прыбытку не прыносяць.

ЯК СПРАВЫ?

Пасяджэнне пачалося з традыцыйнага агляду стану спраў у прадпрыемстве. Старшыня праўлення акрэсліла асноўныя кірункі дзейнасці спажывчакааперацыі, адначасова тлумачачы нюансы дзейнасці розных галін. Так, «Белкаапсаюз» — прадпрыемства шматгаліновае, мае велізарны патэнцыял і перспектывы. Таму і галоўнай задачай дзейнасці яго старшыня назвала максімальнае выкарыстанне ўсіх рэсурсаў і выхад на бясстратную работу.

Яна адзначыла, што задача нялёгкая: ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі не толькі з боку айчынных гандлёвых сетак, але і замежных, вырашыць не даволі складана. Цяпер канкурэнцыя ў гандлі ўвогуле вельмі вялікая, нават буйны рынгавік ці найбольш важкія гульцы гэтага рынку не паказваюць звышприбыткаў, а знішэнне фінансавых вынікаў у гандлі ўжо можна разглядаць як тэндэнцыю.

Тым не менш кіраўнік «Белкаапсаюза» ўпэўнена, што выканаць пастаўленыя Прэзідэнтам задачы прадпрыемству па сілах. Па яе словах, сёння мабілізаваны практычна ўсе рэзервы і першыя вынікі ўжо ёсць — чысты прыбытак за сакавік—красавік гэтага года склаў 4,6 млн рублёў (у мінулым годзе за гэты перыяд — больш чым 9 млн рублёў страт). Колькасць стратных арганізацый у структуры спажывкааперацыі за гэты ж перыяд скарацілася з 47 да 25. Рост нарыхтоўчага аборату склаў 12,2 %, вытворчасці прамысловай прадукцыі — 10,7 %. Па розначным таварааабароце тэмп росту — 100,5 %, таварааабарот сферадаказа харчавання — 102,4 %. У красавіку аб'ёмы экспарту ў параўнанні з аналагічным перыядам 2023 года павялічыліся ў 1,5 раза. Прыбыткова працуюць 77 % арганізацый «Белкаапсаюза». Стабільныя вынікі паказваюць Брэсцкі, Гродзенскі і Магілёўскі рэгіёны. Расце і заработная плата — сярэдняя па прадпрыемстве вырасла на 14,7 %, а непасрэдна прадаўцоў — на 21 %. Няма і запазычанасцяў па ее выплатах. Назіраецца таксама рост аб'ёмаў вытворчасці практычна па ўсіх галінах: ад нарыхтовак да розначнага гандлю.

Але ж у цэлым сістэма пакуль застаецца стратнай, хоць і значна знізіліся сумы страт — у 4,7 раза.

ЯКІЯ ПРАБЛЕМЫ?

Сярод асноўных праблем, якія перашкаджаюць нармальнай рабоце, Інеса Караткевіч назвала стратнасць прадпрыемстваў і разбалансаванасць разлікова-плацежнай дысцыпліны. Адмоўны ўплыў на фінансавае становішча аказвае гандлёвая сфера, якая стратная ажно з 2014 года. З аднаго боку, гэта валаставральная галіна (70 % ад усёй дзейнасці), а з другога — страты, кампенсаваць якія за кошт унутраных крыніц пакуль няма магчымасці. Асноўны артыкул страт — транспартныя расходы. А кампенсаваць іх, напрыклад, уключэннем у цану таварэў нельга. Па той простай прычыне, што іх кошт стане значна большым за аналагічныя ў гарадскіх крамах. Ніхто не будзе спрачацца — такі падыход непрымальны: і горад, і вёска павінны атрымліваць аднолькавы тавары як па кошце, так і па якасці і па асартыменце.

> **«Белкаапсаюз» у лічбах:**
> — 4528 крам;
> — 513 аўтакрам;
> — 779 аб'ектаў грамадскага харчавання (280 з іх — у сельскай мясцовасці);
> — 760 прыёмнарыхтоўчых пунктаў;
> — 300 прамысловых прадпрыемстваў.
>
> Колькасць насельніцтва, якое абслугоўваецца, — 3,2 мільёна.

За 2014—2023 гады сума назапашаных страт склала звыш 200 млн рублёў. Лічба велізарная, але на тое ёсць і аб'ектыўныя прычыны. Статыстыка сведчыць, што стратнасць у спажывкааперацыі найбольшая сярод усіх гандлёвых арганізацый краіны. А чаму так? Адказ просты: менавіта на «Белкаапсаюзе» ляжаць абавязкі абслугоўвання вясковага насельніцтва — 60 % гандлёвых плошчаў «Белкаапсаюза» размешчаны ў сельскай мясцовасці. Відавочная дыспрапорцыя, якая да таго ж не карэлюецца размеркаванне пакупнікоў, зазначыла Інеса Караткевіч. Сапраўды так. Па апошніх данных у гарадах пражывае больш за 78 % насельніцтва Беларусі. Зразумела, што нават разліковая колькасць пакупнікоў у спажывкааперацыі заведама меншая, чым у іншых гандлёвых арганізацый. Больш за тое, «Белкаапсаюз» захоўвае стацыянарныя крамы ў вёсках з колькасцю жыхароў менш за 200 чалавек, якіх на сёння больш за адну тысячу і якія абслугоўваюць каля 123 тысяч чалавек. А кожная такая крама разлікова дае 1,4 тысячы страт у месяц...

Вядома, гаворкі аб спыненні гандлёвага абслугоўвання малаасяленых вёсак не ідзе, але прыйшоў час яго змяніць і перайсці на аўтакрамы. Кіраўнік дзяржавы, па словах Інесы Каратквіч, прапанову падтрымаў. І ў гэтым выпадку значна ўзрастае роля дэпутатаў усіх узроўняў. Яны блізкэй за ўсіх да людзей, і менавіта яны павінны дапамагчы ў растлумачальнай рабоце. Да іх прыслухаюцца, яны знойдуць правільныя словы, упэўнена старшыня «Белкаапсаюза». Так, меры непапулярныя, але ў дадзеным выпадку, у дадзеным момант абсалютна апраўданыя. Дарэчы, аўталаўкі таксама не прыбытковая сфера дзейнасці, яе адносяць да планава-стратнай, але ж расходаў на яе ўсё ж менш.

Працягваючы тэму ўзаемадзеяння з уладнымі структурамі, Інеса Каратквіч выказала надзею на больш высокі ўзровень узаемаразумення ва ўмовах сур'ёзнай фінансавай нагрузкі на спажывкааперацыю. Яна адзначыла, што арганізацыі структуры «Белкаапсаюза» адчуваюць гэтую падтрымку, але ў ёй няма сістэмнасці, няма выпрацаваных адзіных падыходаў да арганізацыі гандлёвага абслугоўвання ў рэгіёнах. Як прыклад — узгадненне маршрутаў аўтакрам, якое адбываецца па заяўным прынцыпе. Часам бывае, што ў вёску, дзе працуе крама спажывкааперацыі, прыязджае яшчэ і аўтакрама ад іншых гандлёвых сетак. Ці не абсурд?

Больш за тое, не рэдкасць і такая з'ява, калі індывідуальныя прадпрымальнікі, напрыклад, абслугоўваюць насельніцтва толькі ў цёплы сезон, а з надыходам халадоў тэхніка пачынае «ламацца» і людзі застаюцца без крамы. Дарэчы, і буйныя рытэйлеры, калі «заходзілі» ў раёны, таксама дакладавалі, што будуць гандлявць і ў вёсках. Аднак на справе ўсё, так бы мовіць, не зусім так. Рэгулярна каляскаць па раёнах толькі аўтакрамы спажывкааперацыі. Логіка камерцыйных структур зразумелая: выгада найперш. Але як з імі канкураваць тым, для кога сацыяльная адказнасць не пусты гук? Кааператыўны гандаль адносіцца менавіта да апошніх. На сустрэчы з дэпутатамі Інеса Каратквіч так прама сказала: «Аўтакрамы — гэта не бізнес, а сацыяльная адказнасць». Сапраўды, у любую пагоду, на любую адлегласць, нябачна, колькі там пакупнікоў будзе (і ці будуць яны ўвогуле), — аўталаўка едзе. Між іншым, за мінулы год аўтакрамы «Белкаапсаюза» прыехалі больш як 14 млн кіламетраў. Гэта 36 разоў да Месяца і назад. Таму, калі глядзець на праблему з улікам вышэйзгаданых акалічнасцяў, ідэя стварэння ў рэгіёнах фондаў для пакрыцця транспартных расходаў спажывкааперацыі не выглядае дрэнная. А чаму і не? Калі рытэйлер не жадае абслугоўвць вёску, то хай кампенсуе расходы тым, хто гэта робіць. Тым больш што абяцалі...

А для спажывкааперацыі гэта стала б глытком свежага паветра. Не «вымываліся» б абаротныя сродкі, можна было б своечасова разлічвацца з пастаўшыкамі і ўкладваць грошы ў мадэрнізацыю. Але ж пакуль гэтага няма. Ускладняе выхад з няпростай сітуацыі і тое, што пастаўшыкі не згаджаюцца даваць тавар пад рэалізацыю, а толькі па прадаплаце. Інеса Каратквіч заўважыла, што выдатна разумее перасцярогі вытворцаў і пастаўшыкоў, — апошнім часам плацежная рэпутацыя «Белкаапсаюза» вымушае жадаць лепшага. І ўсё ж, як кажуць у народзе, зусім не варта з-за аднаго дрэннага ўчынку забываць усё добрае, што было. Да таго ж, адмаўляючы ў пастаўках спажывкааперацыі, вытворцы губляюць пакупнікоў у рэгіёнах і незаўважна, без відавочнай канкурэнцыі, ужо пачынаюць прайграваць замежным вытворцам аналагічных тавараў, якія прасоўваюць іх праз электронны гандаль. Пры гэтым доля айчынных тавараў у крамах «Белкаапсаюза» даходзіць да 90 %. Так, некаторыя ківаюць на тое, што доля кааператыўнага гандлю не такая ўжо вялікая ў структуры рознічнага абароту краіны — усяго 12 %. Яны, можа, і маюць рацыю. Але маюць рацыю і тыя, хто ўпэўнены: вялікія страты пачынаюцца з дробных. Тым больш што аб'ёмы адгрузкі «Белкаапсаюзу» некаторых айчынных тавараў даходзяць да 20 % ад агульнай колькасці. А гэта ўжо адчувальна.

Нельга скідваць з рахунку і той факт, што група сацыяльна значных тавараў у большасці прадстаўлена менавіта ў магазінах «Белкаапсаюза». Што гэта азначае? Толькі тое, што па высокаліквідныя тавары пакупнік ідзе да прыватніка, чые гандлёвыя пункты часам адчыняюцца «дзверы ў дзверы» з кааператыўнымі, а па танныя сацыяльныя — у райспажыўтаварыства. Ці гэта роўныя канкурэнтныя ўмовы? Відавочна, не.

Трэба адзначыць і тое, што «Белкаапсаюз» падыходзіць да вырашэння праблемы з запазычанасцямі адказна і сістэмна, імкнецца паступова скарачаць іх. Але акрамя фінансавых фактараў існуюць яшчэ і тэхнічныя, а таксама шэраг аб'ектыўных, звязаных з гістарычным развіццём спажывкааперацыі.

ЯКОЕ ВЫЙСЦЕ?

Як адзначыла Інеса Каратквіч, у прадпрыемстве распрацавана **праграма рэфармавання спажывецкай кааперацыі на 2024—2025 гады.** Яна прадугледжвае шэраг мерапрыемстваў літаральна па ўсіх напрамках дзейнасці «Белкаапсаюза»: ад рэфармавання арганізацыйнай структуры прадпрыемства да ўдасканалення бізнес-працэсаў.

Так, прадугледжана змяненне фармату абслугоўвання вёсак з насельніцтвам меней за 200 чалавек і аптымізацыя 585 стацыянарных крам за кошт пашырэння зоны дзейнасці і павелічэння колькасці маршрутаў і наўтаў дадатковых аўтакрам. У рознічнай сетцы плануецца ўвод новых гандлёвых аб'ектаў і аднаўленне работы раней зачыненых. Зменіцца і дастаўка тавараў: цяпер ухіл будзе на цэнтралізаваныя пастаўкі прадукцыі непасрэдна ў гандлёвыя аб'екты, што дазволіць скарыстаць складскую гаспадарку, а таксама дагружаць аўтакрамы без заезду на склады. Пашырыцца асартымент і загрузка аўталавак — да 60 % ад узроўню стацыянарных крам. Прыбыткам, як і раней, прыярытэт будзе аддавацца айчынным таварам.

Адна з мэт у грамадскім харчаванні — арганізацыя дзейнасці аб'ектаў брэндавага фармату. Зразумела, што працягнуцца рамонты і рэканструкцыя аб'ектаў, адкрыццё новых, у тым ліку і сезонных. Пры ўмовах комплекснай аўтаматызацыі працэсаў вытворчасці і рэалізацыі, набыцця сучаснага, энергазберагальнага, тэхналагічнага абсталявання гэтыя захады павінны даць плён.

Што да закупак сыравіны і экспартных паставак, то тут таксама акрэслена сур'ёзнае поле дзейнасці. Будуць прагледжаны арганізацыя работы прыёмнарыхтоўчых пунктаў і методыка рэгулявання закупачных цэн. Плануецца таксама набыццё спецтэхнікі, тэхнічнае пераўзбраенне і мадэрнізацыя жывёлабойных пунктаў. У экспартнай дзейнасці — пашырэнне прысутнасці прадпрыемстваў спажывкааперацыі на рынках краін — удзельніц ЕАЭС.

Прамысловая галіна ў структуры «Белкаапсаюза» сёння мае найлепшыя паказчыкі, аднак і яе чакае рэфармаванне: набыццё спецыялізаванага транспарту, у тым ліку хлебавозаў, мадэрнізацыя мясапераапрацоўчага комплексу, аптымізацыя сабекошту вытворчасці, пашырэнне рынкаў збыту за кошт пазасістэмных паставак.

Таксама ва ўрадзе разглядаецца **праект указа Прэзідэнта**, які дазволіць спажывкааперацыі выйсці са складанай сітуацыі. Дакументам прадугледжана магчымасць набыцця ў 2024—2026 гадах 260 аўтакрам у лізінг. Аплата будзе за кошт рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў на рэвальвіруемай аснове, а выплаты ўзнагароды лізінгадаўцам — за кошт арганізацый спажывкааперацыі — лізінгаатрымальнікаў. Гэта, безумоўна, вельмі значная дапамога прадпрыемству, які здатакове крэдытаванне для разлікаў з беларускімі вытворцамі за спажывецкія і прамысловыя тавары.

У праект указа закладзена таксама кампенсацыя расходаў па дастаўцы тавараў у сельскую мясцовасць — штогадовае пакрыццё іх за кошт мясцовых бюджэтаў у памеры поўнага кошту ГЗМ на аўталаўкі і дастаўку тавараў у стацыянарныя вясковыя магазіны. Немалаважнай будзе і навацыя, якая дазволіць праводзіць аўтакрамамі заказныя продажы мясцовых інавацыйных фондаў. Гэта ж датычыцца і мадэрнізацыі матэрыяльна-тэхнічнай базы: мясцовыя выканаўчыя органы ўладны змогуць накіроўваць сродкі абласных бюджэтаў на рамонт, будаўніцтва і рэканструкцыю гандлёвых і прамысловых аб'ектаў спажывкааперацыі.

У якасці высновы можна адзначыць, што мерапрыемствы, прадугледжаныя праектам указа, акрамя фінансавага, маюць і другі бок. Яны паказваюць, што дзейнасць спажывкааперацыі ў нашай краіне — справа дзяржаўная, і дзяржава не пакіне прадпрыемства сам-насам з праблемамі. Таму што менавіта ад работы «Белкаапсаюза» залежыць якасць жыцця вёскі. А страціўшы вёску — страцім краіну, сказаў у свой час Прэзідэнт.

У заканчэнні сустрэчы Інеса Каратквіч адказала на пытанні дэпутатаў, якія закраналі амаль усю сферу дзейнасці прадпрыемства: ад асартыменту аўтакрам да гатоўнасці «Белкаапсаюза» забяспечыць мабілізацыйныя мерапрыемствы.

Уладзімір ВЯРЭНІЧ.

❍ Даслоўна

Алена ЛАПЦЕВА, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы, гандлі і будаўніцтве:

«Неабходнасць сустрэчы выклікана тым, што абноўлены склад дэпутацкага корпуса і трэба выпрацаваць напрамкі сумеснай работы з сістэмай «Белкаапсаюза». Безумоўна, яна будзе накіравана на ўдасканаленне якасці гандлёвага абслугоўвання насельніцтва, найперш вясковага. Таксама сумесныя дзеянні будуць спрыяць павышэнню эфектыўнасці гаспадарання сістэмы спажывецкай кааперацыі ў цэлым.

Дэпутацкі корпус гатовы сёння дапамагчы прадпрыемству, падстаўіць плячо, разабрацца ва ўсіх пытаннях. Мы гатовы да сумеснай работы. Адзначу, што дэпутатамі мінулага скліканя напрацаваны добры вопыт узаемадзеяння з гандлёвай сферай і мы працягнем гэтую работу».

Антыфэйк

Без тармазоў

Як пусты кузаў віноўнікам ДТЗ зрабілі

Днямі ў далёкім расійскім Кемерава здарылася трагедыя. На месце сутыкнуліся два перапоўненыя трамваі. Лік пацярпелых — больш за 140 чалавек. Не абышлося і без ахвяр — праз нейкі час, нягледзячы на ўсе намаганні ўрачоў, адзін з траўмаваных памёр.
Заведзена некалькі крымінальных спраў. Паводле папярэдніх даных, у адной з машын на гавароце адмовіла тармазная сістэма, вядзецца расследаванне. Па яго выніках вінаватым — тым, хто выпусціў нясправны трамвай у рэйс, тым, хто адказвае за яго тэхнічны стан, будуць адказваць перад судом. Звычайная прынятая ва ўсім свеце працэдура ў выпадку падобных надзвычайных здарэнняў.

Але некаторыя каналы не сталі чакаць высноў следчых і назначылі вінаватым... беларускага вытворцу. Нібыта нясправны трамвай быў зроблены на «Белкамунмашы». Інфармацыю тут жа падхапілі збегльця і іхняя рэсурсы і кінуліся яе смакаваць: маўляў, з-за нясправнасці беларускага трамвая пацярпела сотня людзей. Набеглі і каментатары, якім не дай паесці, але дай зганіць што-небудзь беларускае. Як кажуць, без тармазоў. Магчыма, яны такім чынам зарабляюць сабе бонусы ў гаспадароў, каб не выгналі, а можа, проста не хапае мазгоў, каб падумаць, удакладніць, пачытаць штосьці ў іншых крыніцах, а не толькі ў тых, якіх ужо шмат разоў літаральна тыцкалі носам ва ўласную хлусню.

Калі б кідкія на сенсацыю каналіны воіны паглядзелі за межы свайго, прыдумагага імі ж свету, яны б даведаліся з таго ж такога любімага імі тэлеграма, з афіцыйнага канала «Белкамунмаша», што гэта прадпрыемства раней пастаўляла на Кузбас толькі кузавы. Чытаем у заяве прадпрыемства: «У прыватнасці, у перыяд з 2011 да 2013 гг. у г. Кемерава было паставлена 8 кузавоў трамвайных вагонаў мадэлі 60102. Гэты праект прадугледжваў пастаўку кузавоў трамвайных вагонаў першай камплектнасці (без трамвайных цялежак) вытворчасці «Белкамунмаша» для выкарыстання ў ходзе мадэрнізацыі трамвайных вагонаў КТМ. Усе работы па мадэрнізацыі трамвайных цялежак ад трамвазў КТМ, работы па ўстаноўцы кузава трамвайнага вагона на каляскі, а таксама пусканаладачныя работы і выпрабаванні ажыццяўляліся ў г. Кемераве сіламі эксплуатуючай арганізацыі».

Карацей кажучы, дастаткова ўважліва прачытаць і супастаўіць, дзе пусты кузаў, а дзе тармазы, і стане зразумела, што беларускае прадпрыемства тут дакладна ні пры чым. Але ж «уважліва прачытаць» і «супастаўіць» — гэта не пра тых, хто спрабуе здалёк цяўкаць на ўласную кроўю. І не толькі цяўкнуць. Глядзіш, гаспадар якіх аб'ёдкаў кіне ці хаця б пад хвост не дасць.

А для тых, хто ўмее чытаць і думаць, гэта яшчэ адна нагода памятаць аб тым, як сёння лёгка распаўсюджваюцца фэйкі. І аб тым, што сёння ядомая прыказка актуальная крыху ў відазмененым выглядзе: «Не даявяй. Заўжды правярай».

Аляксей КЛІМАЎ.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Без тачки не дачник»

Настоящие правила проведения рекламной игры «Без тачки не дачник» (далее – правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Без тачки не дачник» (далее – рекламная игра).

1. Сведения об организаторе.

Общество с ограниченной ответственностью «Триовист» (далее – организатор). УНП 190806803.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190806803 решением Минского горисполкома от 22 февраля 2007 года № 339.

Место нахождения организатора: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Победителей, д. 100, оф. 203, 2-й эт.

Почтовый адрес организатора: Республика Беларусь, г. Минск, 220020, пр. Победителей, д. 100, оф. 203, 2-й эт.

Адрес электронной почты: info@21vek.by.

2. Наименование рекламной игры.

Наименование рекламной игры – «Без тачки не дачник».

3. Территория проведения рекламной игры.

Рекламная игра проводится на территории Республики Беларусь.

4. Сроки проведения рекламной игры.

Срок начала рекламной игры: 10 июня 2024 года;

Срок окончания рекламной игры: 02 октября 2024 года (включая период розыгрыша и выдачу призов, опубликования результатов проведения рекламной игры).

5. Состав комиссии по проведению рекламной игры.

Организатором создана комиссия по проведению рекламной игры (далее – комиссия) в следующем составе:

Председатель комиссии: Басалыга Анна Мария Андреевна, начальник сектора продвижения ООО «Триовист».

Члены комиссии:

1. Ганисевская Варвара Сергеевна, ведущий юрисконсульт ООО «Триовист»;
2. Дашкевич Ангелина Леонидовна, специалист по маркетингу ООО «Триовист»;
3. Кульпанович Екатерина Андреевна, специалист по маркетингу ООО «Триовист»;
4. Табанькова Карина Сергеевна, специалист по маркетингу ООО «Триовист»;
5. Бондарь Никита Сергеевич, бизнес-аналитик ООО «Удобные финансы».

6. Наименование товаров (работ, услуг) или их групп, в целях стимулирования реализации которых проводится рекламная игра.

Рекламная игра проводится в целях стимулирования реализации следующего товара:

Наклейка фирменная квадратная 21 vek, код на сайте: 8932393

7. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником рекламной игры.

Участниками рекламной игры могут быть:

• граждане Республики Беларусь, достигшие возраста 18 лет, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь;

• иностранные граждане, достигшие возраста 18 лет, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь и имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь;

• лица без гражданства, достигшие возраста 18 лет, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь и имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь.

К участию в рекламной игре допускаются физические лица, выразившие желание принять участие в рекламной игре, заказывающие, приобретающие или использующие игровой товар исключительно для личных, семейных, домашних и иных нужд, не связанных с осуществлением предпринимательской деятельности, отвечающие требованиям правил проведения рекламной игры на условиях, предусмотренных в правилах проведения рекламной игры.

Участником рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства. К участию не допускаются члены комиссии.

Для участия в рекламной игре участнику необходимо:

7.1. В период **с 10 июня 2024 г. по 01 августа 2024 г. включительно:**

7.1.1. Изучить правила проведения рекламной игры и политику обработки, хранения и использовании персональных данных, размещенные на сайте www.21vek.by.

7.1.2. Оформить на сайте интернет-магазина www.21vek.by заказ игрового товара, при этом:

подтвердив согласие на участие в рекламной игре на сайте интернет-магазина www.21vek.by;

подтвердив на сайте интернет-магазина www.21vek.by согласие на обработку, хранение и использование персональных данных в рамках проводимой рекламной игры.

7.1.3. При оформлении заказа игрового товара заполнить форму интернет-заказа, указав следующие данные:

фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (обязательно, если таковое имеется);

абонентский номер мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи участника в международном формате (обязательно);

адрес электронной почты (обязательно).

7.1.4. Оплатить заказанный игровой товар в соответствии с выбранным условием оплаты, представленным на сайте интернет-магазина www.21vek.by.

Покупатель становится участником рекламной игры при выполнении всех условий правил.

Каждый участник может принимать участие в рекламной игре неограниченное количество раз при условии оплаты каждого игрового товара в отдельном заказе и выполнения остальных требований, необходимых для участия в рекламной игре. Для участия в рекламной игре достаточно приобрести один игровой товар.

После оплаты игрового товара участнику присваивается игровой код, который представляет из себя девятизначный номер, идентичный номеру интернет-заказа, в котором приобретался игровой товар.

Игровой код начинает действовать со следующего дня после даты оплаты игрового товара. Один игровой код может принимать участие в рекламной игре только 1 (один) раз.

8. Призовой фонд рекламной игры.

Источником формирования призового фонда является имущество и денежные средства организатора.

Призовой фонд состоит из призов, общее количество которых составляет **38 единиц (штук), общий размер призового фонда составляет 75561,20 бел. руб.**:

№	Наименование приза	Краткое наименование приза	Кол-во, шт.	Цена, бел. руб., 1 шт.	Общая сумма, бел. руб.
1	Надувной бассейн Intex Easy Set / 28106NP (244x61), страна происхождения Китай	Надувной бассейн Intex	5	36,53	182,65
2	Угольный гриль / BBQ GRILL (угольный гриль Sundays KY802), страна происхождения Китай	Угольный гриль Sundays	5	27,36	136,80
3	Автохолодильник Sundays SN-24 (синий), страна происхождения Китай	Автохолодильник Sundays	10	65,62	656,20
4	LUC-131 6PC TEXTILENE FOLDING CHAIR SET-BEIGE (комплект садовой мебели Sundays LUC-131 (Brown)), страна происхождения Китай	Комплект садовой мебели Sundays	1	146,36	146,36
5	Electric Miniculitivator Garvill MC360-22 (миникультиватор Garvill MC360-22), страна происхождения Китай	Миникультиватор Garvill	5	103,79	518,95
6	Мойка высокого давления Garvill ABW-70, страна происхождения Китай	Мойка высокого давления Garvill	5	97,95	489,75
7	Качели садовые «Sundays Garden Варна-2» с1392 / ИЯУБ 49.22 / Декларация о соответствии Евразийского экономического союза ЕАЭС № BY/112 11.01 TP025 018.01 01395	Качели садовые Sundays	1	305,52	305,52
	Денежные средства в размере 14,57 бел. руб.			14,57	14,57
8	55INCH Mini Trampoline (Tricolor) (батут Sundays Acrobat-D140 (с сеткой, разноцветный)), страна происхождения Китай	Батут Sundays	5	75,44	377,20
9	Легковой автомобиль Geely EMGRAND (SS11A1), седан, Comfort plus, 1.5, бензин, АКПП6, 4x2, интерьер: черный, _0, цвет: Кристально-белый SS11, Y4K8824Я6KИ201437, 2024 г.в., страна происхождения Беларусь	Автомобиль Geely EMGRAND	1	63304,92	63304,92
	Денежные средства в размере 9428,28 бел. руб.			9428,28	9428,28

Каждый участник может выиграть только 1 (один) приз в рамках рекламной игры.

9. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда. Порядок определения победителей.

Розыгрыш призового фонда будет производится в 1 (один) этап. Пункты 8 настоящих правил будут разыграны в прямой последовательности.

Розыгрыш состоится 02 сентября 2024 года в 16.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Победителей, д. 100, оф. 203, 2-й этаж.

Розыгрыш призов проводится открыто с возможностью присутствия участников рекламной игры. К розыгрышу допускаются участники, выполнившие условия, установленные в п. 7 настоящих правил.

До даты розыгрыша призов данные об участниках рекламной игры формируются в список участников (далее – список) с указанием: игрового кода, фамилии, имени, отчества (при наличии), абонентского номера мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи участника в международном формате, адреса электронной почты, даты совершения оплаты игрового товара.

Формирование списка осуществляется в хронологической последовательности по дате и времени совершения участником рекламной игры действий пункта 7.1.4 настоящих правил. При совпадении у нескольких участников рекламной игры даты и времени совершения ими действий пункта 7.1.4 настоящих правил такие участники включаются в список участников рекламной игры с учетом алфавитного порядка по фамилии, собственному имени, отчеству (если таковое имеется).

В период с 19 августа 2024 года по 01 сентября 2024 года (включительно) организатор уведомляет участника рекламной игры о его порядковом номере в списке участников рекламной игры путем направления извещения (уведомления) на электронный адрес, указанный участником при выполнении пункта 7.1.3 настоящих правил.

За ходом розыгрыша призового фонда следит комиссия. Розыгрыш производится в следующем порядке:

Для проведения розыгрыша используется непрозрачная урна и карточки с игровыми кодами в количестве, равном количеству присвоенных игровых кодов. Общее количество карточек помещается в непрозрачную урну, определение победителей идет путем случайного извлечения карточки с игровым кодом участника.

Итоги розыгрыша фиксируются в протоколе розыгрыша, подписанном присутствующими членами комиссии.

10. Порядок уведомления победителей о результатах розыгрыша. Место, порядок и срок получения выигрышей.

Победители извещаются о выигрыше с 03 сентября 2024 г. и не позднее 16 сентября 2024 года (включительно) посредством направления уведомления на адрес электронной почты, указанный при оформлении заказа на сайте www.21vek.by, и/или по контактному номеру, указанному при оформлении заказа на сайте www.21vek.by.

Победители могут получить призы № 1, № 2, № 3, № 4, № 5, № 6, № 7, № 8 по 02 октября 2024 года (включительно) при предъявлении паспорта (вида на жительство или иных документов, удостоверяющих личность победителя и/или его доверенного лица при предъявлении соответствующей доверенности) в пункте выдачи заказов интернет-магазина www.21vek.by по адресу: **г. Минск, пр-т Дзержинского, 3Б (1-й этаж ТЦ «Океан»).**

Организатор не оплачивает участникам рекламной игры расходы по оплате услуг связи. Организатор не оплачивает участникам рекламной игры расходы, связанные с проездом к месту получения призов, а также расходы, связанные с транспортировкой приза из места выдачи.

Приз № 9 может быть получен победителем по 02 октября 2024 года (включительно) при предъявлении паспорта (вида на жительство и (или) иного документа, подтверждающих личность победителя и/или его доверенного лица при предъявлении соответствующей доверенности) по прибытию на место хранения по адресу: Республика Беларусь, Минский район, район деревни Боровая, дом 2. Организатор не оплачивает расходы и дополнительные платежи, связанные с государственной регистрацией и постановкой на учет автомобиля.

Приз остается в распоряжении организатора в случае, если: победитель не явился в срок, указанный в п. 10 настоящих правил; либо с победителем не удается связаться и уведомить о выигрыше на основании данных, указанных в регистрационных формах; либо победитель сообщил об отказе от приза; либо победитель не соответствует всем условиям участия в рекламной игре; победитель рекламной игры и (или) его наследник, опекун или законный представитель, включен на дату выдачи приза в определяемый в установленном порядке перечень организаций и физических лиц, в том числе индивидуальных предпринимателей, причастных к террористической деятельности.

Выплата денежного эквивалента призов не производится. Денежная компенсация за приз не выдается, в том числе за отказ от приза по каким-либо причинам или в случае, если приз не будет востребован, в случаях, когда приз согласно правил (п. 10 правил) остается в распоряжении организатора.

Организатор при вручении призов № 7 и № 9, содержащих денежную часть приза, выступает налоговым агентом и удерживает сумму подоходного налога с доходов в денежной форме (из денежной части приза). Начисление, удержание и перечисление подоходного налога производится в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь.

11. Публикация правил рекламной игры, а также результатов проведения рекламной игры. Сроки публикации.

Правила рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала рекламной игры.

Результаты рекламной игры будут опубликованы на сайте интернет-магазина www.21vek.by в срок не позднее 09 сентября 2024 года.

Дополнительную информацию о правилах и условиях участия в рекламной игре можно получить на интернет-сайте www.21vek.by и по телефону + 375 29 3-021-021.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Документ, подтверждающий быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) возмещает затраты на публикацию извещения о проведении торгов и оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в следующем размере: по лоту № 1 – 2 (два) процента от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лоту № 2 – 4 (четыре) процента. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» по лоту № 1 от 22.10.2022, по лоту № 2 от 16.12.2021.

Аукцион состоится **10.07.2024 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.07.2024** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320. Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11. Тел. для осмотра 8 (01776) 28-516, 8 (029) 347-22-75.**

УНП 690368381

Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

Извещает о внесении изменений в извещение о продаже имущества ОАО «Строй-газ, г. Брест», опубликованное в газете «Звязда» от 06.06.2024.

Лот № 1: экскаватор-погрузчик ДЭМ-1143, год выпуска 2012, регистрационный знак АВ-1 9890, заводской номер 1034. **Начальная цена (с учетом НДС):** 36 000,00 руб. **Задаток:** 1 800,00 рублей

Телефон для справок 8 (0162) 40-87-01
Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

УНП 200928345

КРЫВАВЫ ВЫБАР

Чым адзначылася ўсеагульнае галасаванне ў Мексіцы?

У Мексіцы завяршыўся найбуйнейшы ў гісторыі краіны выбарчы працэс, на якім прайшло галасаванне па больш чым 20 тысячах мандатаў на дзяржаўныя пасады. Са сваімі перавагамі вызначыліся звыш 98 мільёнаў грамадзян, якія маюць права голасу. Апроч прэзідэнта, жыхары краіны выбралі 500 дэпутатаў ніжняй палаты парламента, таксама 128 сенатараў. На рэгіянальным узроўні вызначыўся лёс васьмі губернатарскіх крэслаў і пасады мэра сталіцы краіны. Чым жа адзначалася маштабнае ўсеагульнае галасаванне ў Мексіцы?

Час трансформацыі

Па выніках галасавання Клаўдыя Шэйнбаум Пардо стала першай жанчынай-прэзідэнтам у гісторыі Мексікі, паведаміла «Бі-бі-сі». Яна была вылучана на выбары кааліцыяй Sigamos Haciendo Historia («Працягнем ствараць гісторыю»), у якую ўвайшлі тры левыя партыі, у тым ліку кіруючая Moreno дзейнага прэзідэнта Андрэса Мануэля Лопэса Абрадора.

У 2007 годзе Шэйнбаум стала адным з калектыўных лаўрэатаў Нобелеўскай прэміі міру ў якасці члена Міжурадавай групы экспертаў па зменнені клімату. Яна аўтар больш за 100 артыкулаў і дзвюх кніг па тэмах навакольнага асяроддзя. Доўгі час яна сумяшчала акадэмічную дзейнасць і палітыку. «Я выраслa з верай у тое, што палітыка можа змяніць свет нараўне з акадэмічным і навуковым падыходамі», — заяўляла Клаўдыя Шэйнбаум.

Мексіканцы называюць яе прозвішча Клаўдыя. Ёй 61 год, яна мае дваіх дзяцей, прафесар у галіне біяінжынерыі і былы мэр Мехіка, горада з насельніцтвам больш за дзевяць мільёнаў чалавек. Пераможца прэзідэнцкіх выбараў паабяцала «клапаціцца пра кожнага мексіканца без выключэння».

На гэта ж звярнуў увагу і Лопэс Абрадор, які пасля чыгуначнага выбуху ў Мехіка-Сіці ў 2021 годзе ўзначаліў рэканструкцыю лініі. Ён заявіў, што ў Мексіцы «ніхто не будзе ўтойваць інфармацыю, ніхто не будзе хаваць праблемы, і ўсе будуць ведаць, што адбываецца».

Пасаду прэзідэнта краіны Клаўдыя Шэйнбаум афіцыйна зойме 1 кастрычніка. Яна прымае кіраўніцтва 130-мільённай Мексікай у вельмі няпростых умовах: больш чым траціна насельніцтва жыве за рысай беднасці, назіраецца трывожны ўзровень забойстваў жанчын, працягваецца гвалт з боку арганізаваных злачынных груповак, расце напружанасць на граніцы з ЗША.

Як адзначаюць аналітыкі, менш перакананчы вынік кааліцыі «Працягнем разам ствараць гісторыю» можа стаць сур'ёзнай перашкодай для шматлікіх рэформаў, задуманых Шэйнбаум, паколькі простая большасць, хутчэй за ўсё, запатрабуе сумяшчэння з апазіцыяй. У прыватнасці, спадчыніца Лопэса Абрадора запланавала змены ў Вярхоўным судзе і пенсійнай сістэме. Акрамя таго, яна паабяцала прадоўжыць інвестыцыі ў буйныя інфраструктурныя праекты ў гістарычна бедных рэгіёнах Мексікі.

Галоўнай жа задачай новага прэзідэнта стане барацьба з масавай злачыннасцю, якая, нягледзячы на ўсе намаганні адыходзячага кіраўніка дзяржавы, застаецца сапраўдным праклёнам краіны. Сярод іншага Клаўдыя Шэйнбаум мае намер стварыць новую сістэму крымінальных расследаванняў. Напрыклад, пераможца выбараў збіраецца пашырыць спіс злачынстваў, за ўчыненне якіх падазраваных змогуць да суда адпраўляць за краты на нявызначаны тэрмін.

Мяркуючы па тым, як праходзіла выбарчая кампанія ў Мексіцы, жаданне Шэйнбаум прадоўжыць вайну свайго папярэдніка са злачынныміі групоўкамі і нават не маштабаваць абгрунтаванае. Паводле меркавання назіральнікаў, цяперашняя гонка стала самай жорсткай у сучаснай гісторыі дзяржавы. Па ўсёй Мексіцы дзясяткі кандыдатаў, іх сваякі і члены партый падвергліся нападам. Паводле звестак Reuters, напярэдадні сёлетніх выбараў загінулі мінімум 37 чалавек, якія прэтэндавалі на розныя пасады. Раней кандыдатаў забівалі ў выніку мэтанакіраваных нападаў, а цяпер злачынцы пачалі расстрэльваць удзельнікаў мерапрыемстваў падчас перадвыбарнай кампаніі. У прыватнасці, Альфрэда Кабрэра, які балатаваўся на пасаду мэра ў горадзе Каюка-дэ-Бенітэс, застрэлілі проста на мітынгу.

Нават дзень выбараў вызначыўся ўспышкамі гвалту, хаця для забеспячэння мірнага галасавання па ўсёй краіне на дзяржаўства выйшлі тысячы вайскоўцаў. Напрыклад, у мястэчку Куіцза (штат Мічаакан) кандыдат у гарадскі савет Ісраэль Дзьлгада быў застрэлены двума кілерамі на матацыкле літаральна за пару гадзін да старту галасавання. Сам працэс волевыяўлення ў Куіцза праходзіў пад узмоцненай аховай паліцыі, а пасля візітаў на ўчасткі выбаршчыкі накіроўваліся да дома забітага палітыка, каб паставіць свечкі за спачын яго душы на імправізаваным алтары. Таксама паведамлялася аб выкраданні чалавека проста з выбарчага ўчастка ў іншым горадзе. Зрэшты, у параўнанні з тым, як ішла перадвыбарная гонка, дзень галасавання можна назваць адносна спакойным.

Свінец або грошы

Прэзідэнцкі тэрмін Лопэса Абрадора — з 2018 да 2024 года — адзначаны самай вялікай колькасцю забойстваў за апошні час, падлічылі ў даследчай кампаніі па палітычных пытаннях TResearch. У сярэднім у гэты перыяд фіксавалася 95 такіх злачынстваў штодня — гэта прыкладна адно забойства кожныя 15 хвілін. У эпоху яго папярэднікаў яны здзяйсняліся з меншай перыядычнасцю — у сярэднім 71 раз за дзень (гэта кожныя 20 хвілін).

За час кіраўніцтва краінай Абрадорам з-за гэтага загінулі 178 тысяч чалавек, 12 тысяч з іх — дзеці і падлеткі ва ўзросце да 17 гадоў, 5 тысяч — гэта забойствы жанчын з-за дыскрымінацыі па гендарнай прыкмеце. Найбольшая колькасць ахвяр прыпадае на штаты Гуанахуата, Мехіка і Баха Каліфорнія. У цэлым на Мексіку прыпадае чвэрць забойстваў, якія ўчыняюцца ў Лацінскай Амерыцы: 29,6 тысячы з больш як 117 тысяч.

Тым не менш, паводле ацэнак дырэктара Цэнтра ібераамерыканскіх даследаванняў Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта Віктара Хейфеца, рост узроўню злачыннасці — доўгі працэс, паведаміў iz.ru. Лічыць, што ён адбыўся менавіта пры ўрадзе Лопэса Абрадора, не зусім дакладна. «Гэта канфлікт, які ўзмацніўся яшчэ ў 2000-я гады, калі праваахансерваты ўпершыню прыйшлі да ўлады і пачалі вайну супраць картэляў, — адзначаў эксперт. — Ён не здолеў дабіцца поспеху ў гэтай барацьбе, з таго часу рэальнага скарачэння ўзроўню гвалту не адбывалася».

За забойствамі палітыкаў стаіць арганізаваная злачынніцца, улэўнены мексіканскія аналітыкі. Таму, што выбар крымінальных груповак падае на чыноўнікаў муніцыпальнага ўзроўню, ёсць сваё тлумачэнне. «Хоць мы і не бачым значнага прагрэсу ў расследаванні забойстваў, за большасцю з іх, хутчэй за ўсё, стаяць прадстаўнікі наркакартэляў, якія шукаюць магчымасць распаўсюдзіць свой уплыў на новыя рэгіёны краіны», — заявіў iz.ru мексіканскі эксперт у галіне бяспекі Давід Сяўсера.

Крымінальным групоўкам неабходны паслухмяныя палітыкі, каб працягваць зарабляць буйныя сумы. Калі чыноўнік будзе заплюшчваць вочы на крымінал, ён можа атрымаць хабар. Калі ж адмовіцца — пачне атрымліваць пагрозы і можа быць забіты. Як інструмент уздзеяння на палітыкаў крымінальныя групоўкі выкарыстоўваюць ціск на членаў іх сем'яў. Картэлям неабходны доступ да рэсурсаў і інфармацыі, лічыць эксперт па бяспецы Сандра Лэй. На яе думку, апошнія атакі пацвярджаюць, што крымінальныя групоўкі ў многіх населеных пунктах знаходзяцца пад абаронай мясцовых чыноўнікаў, падкупленых ці напалоханых.

«Картэлі хацелі б мець сваіх людзей ва ўладзе, — тлумачыць Віктар Хейфец. — Гэта жаданне захаваць свой рэгіянальны ўплыў, забяспечыць лаяльнасць тых ці іншых палітычных кандыдатаў. Партыя для іх значэння не мае. Яны працуюць па формуле plomo o plata («свінец або грошы») — ці мы цябе прыстрэлім, ці ты працуеш з намі». На прадстаўнікоў афіцыйнай улады партыі Morena даводзіцца, па падлiках Integralia, звыш 60 ахвяр. «У сітуацыі электаральна працэсу картэлі імкнуцца падтрымаць фінансава тыя партыі, якім блізкія іх крымінальныя праекты. Калі кандыдаты адмаўляюцца ад гэтага альянсу або ўступаюць у сувязь з іншай крымінальнай асацыяцыяй, адбываюцца такія атакі», — працягвае Давід Сяўсера.

Да апошніх такіх інцыдэнтаў, хутчэй за ўсё, маюць дачыненне розныя картэлі, ліцыць мексіканскі эксперт. Картэлі «Халіска» і «Сіналоа» моцна разрасліся ў апошні час і шукаюць яшчэ большай тэрыторыі ўплыву. Гэта ў тым ліку можа тлумачыць высокія паказчыкі крымінальну падчас сёлетняга электаральна цыкла. Тыя выпадкі, што адбыліся яшчэ ў пачатку перадвыбарнай гонкі, не былі ў поўнай меры расследаваны, вінаватых не пакараныя, кажа Сяўсера. Калі б правасудзіце працавала, такой колькасці ахвяр можна было б пазбегнуць.

Доўгі працэс

Самі па сабе забойствы ў Мексіцы — не часткa палітычнай культуры, але высокая ступень гвалту і канфліктнасць — не складнікі, лічыць Віктар Хейфец. Гэта краіна, у якой неаднойчы былі ўнутраныя ўзброеныя канфлікты, войны, рэвалюцыі, звяржэнне ўрадаў сілавым шляхам, перш за ўсё ў XIX — пачатку XX стагоддзя. Вядома, што часта маладыя людзі ўстаюць на крымінальны шлях праз беднасць. Менавіта на барацьбу з ёй і накіравалі свае намаганні ўлады, замест таго каб наўпрост змагацца з групоўкамі на вуліцах. Апаненты Лопэса Абрадора сцвярджаюць, што яго палітыка правалілася і толькі прывяла да росту злачыннасці ў краіне. «Тыя, хто такое кажа, на мой погляд, паводзяць сябе непрыстойна, таму што гэта класічны падыход тых, у каго ёсць грошы: у мяне ўсё дрэнна, няхай яны цяпер навучацца жыць», — сказаў Віктар Хейфец. Барацьба за захаванне бяспекі ў Мексіцы, паводле слоў эксперта, — доўгі працэс, падчас якога неабходна займацца выхаваннем насельніцтва, змяненнем палітычнай культуры, выратаваннем сацыяльна-эканамічных праблем, якія ўзмацняюць самі магчымасці гвалту.

Высокія вынікі Клаўдыі Шэйнбаум на выбарах прэзідэнта Мексікі былі чаканыя. Пра гэта iz.ru заявіў дырэктар Лацінаамерыканскага цэнтра імя Уга Чавеса Ягор Лідоўскі. «Шэйнбаум — пераемніца дзейнага прэзідэнта Лопэса Абрадора. Ён зарэкамендаваў сябе як дастаткова разумны сацыяліст, які імкнецца да незалежнасці Мексікі. Сказаць, што ўсе праблемы Абрадорам былі вырашаны, немагчыма, але, тым не менш, народ Мексікі ўбачыў, што ён спрабуе нешта зрабіць у гэтым кірунку. Шмат было створана сацыяльных праграм, і Клаўдыя Шэйнбаум — гэта той чалавек, які дэкларуе, што яна будзе працягваць палітыку Абрадора, будзе працягваць сацыяльныя пераўтварэнні Мексікі. Таму народ яе выбраў», — адзначыў эксперт.

На думку Лідоўскага, нельга сказаць, што Шэйнбаум — гэта «прэзідэнт-рэвалюцыянер», хаця яна і адносіцца да левых: «Але гэта ў любым выпадку лепш, чым праамерыканская апазіцыя. Таму я думаю, што Шэйнбаум будзе працягваць палітыку, якую вёў Абрадор, гэта значыць, лавіраваць паміж двума цэнтрамі сілы, не пераходзіць ні на той, ні на іншы бок, захоўваючы нейтралітэты, займацца непасрэдна тымі рэчамі, сацыяльнымі праграмамі, пра якія гаварылася ў перадвыбарных абяцаннях».

Вынікі прэзідэнцкіх выбараў у Мексіцы — выдатны вынік для краіны. Такое меркаванне ТАСС выказала прафесар Сталінскага аўтаномнага інстытута Ана Тэрэса Гуцьерэс дэль Сід. «Гэта нашмат лепш для росту эканомікі і развіцця краіны, паколькі ў адваротным выпадку гаворка ішла аб устаноўленні алігархічнай сістэмы, пры якой выгаду атрымалі б толькі найбольш багатыя, — заўважыла эксперт. — Шэйнбаум будзе кіраваць з аглядкай на шырокія грамадскія масы, яна працягне сацыяльныя праграмы, развіцьё бясплатнай адукацыі і аховы здароўя. Гэта прывядзе да большай сацыяльнай справядлівасці ў краіне». І, будзем спадзявацца, да паляпшэння сітуацыі ў плане бяспекі.

Захар БУРАК.

Даслоўна

«У аснове — узаемавыгаднае супрацоўніцтва»

У снежні 2022 года ў Кангрэсе Мексіканскіх Злучаных Штатаў была створана група дружбы з беларускім парламентам. Лідар Партыі працы Альберта Аная заявіў, што яго партыя падтрымлівае палітыку Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, накіраваную на пабудову шматпалярнага свету, без дыктату ЗША. З нашага боку беларуска-мексіканскую парламенцкую групу дружбы ўзначальвае **член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Сяргей КЛІШЭВІЧ.**

«Ва ўмовах геапалітычнай трансформацыі, якая цяпер адбываецца ў свеце, многія дзяржавы планеты вызначаюцца, якую карціну свету падтрымліваць: аднапалярную, дзе кіруе закон моцнага, або шматпалярную, заснаваную на ўзаемнай павазе да інтарэсаў усіх краін і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Міжнародная палітыка Прэзідэнта нашай краіны ў авангардзе пабудовы новага справядлівага светапарадку. Нездарма Аляксандр Лукашэнка ў віншаванні Клаўдыі Шэйнбаум з нагоды яе абрання на пасаду кіраўніка Мексікі пацвердзіў зацікаўленасць у наданні большай дынамікі беларуска-мексіканскаму ўзаемадзеянню. Мексіка таксама вызначылася — яна лагічна падтрымлівае пабудову шматпалярнага свету. У той жа час яе размяшчэнне каля граніцы ЗША адбіваецца на больш асцярожнай міжнародной палітыцы. Аднак гэта не перашкаджае ёй выбудоўваць добрыя адносіны з тымі краінамі свету, якія ідэйна блізкія сучаснай Мексіцы, — адзначыў Сяргей Клішэвіч. — У гэтых умовах наша актыўнае міжпарламенцкае і міжпартыйнае супрацоўніцтва — добрая база для стварэння насамрэч добрых, узаемавыгадных дойгатэрміновых адносін па самых розных напрамках сацыяльна-эканамічнага развіцця нашых краін. У гэтым і ёсць сэнс шматпалярнага, справядлівага новага сусветнага парадку».

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор электронных торгов: Новополький сельский исполнительный комитет, 222845, Минская область, Пуховичский район, Новополький сельсовет, аг. Новополье, ул. Центральная, 21, +375 17 133 03 16, +375 17 134 34 49.

Оператор электронной торговой площадки: ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».
Торги проводятся 12.07.2024 на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by. Время торгов** устанавливается инструментарием площадки в автоматическом режиме.

№ лота	Местонахождение земельного участка; кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Инженерная инфраструктура	Начальная цена лота, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Сумма затрат на организацию и проведение торгов, бел. руб.
1	д. Дудичи, ул. Полевая, 20; 624484003101000238	0,2100	Подъездные пути в песчано-гравийном исполнении; водопровод – сети водоснабжения отсутствуют; электроснабжение – техническая возможность подключения к сети ВЛ-0,4 кВт, разрешенная к использованию мощность 7,5 кВт; Газоснабжение – имеется возможность газификации земельного участка	10 500,00	2 100,00	2 832,82 + стоимость размещения в СМИ и на БУТБ
2	д. Бельковичи, ул. Пасечная, 9А; 624484001101000102	0,0906	Подъездные пути в песчано-гравийном исполнении; водопровод – сети водоснабжения отсутствуют; электроснабжение - разрешенная к использованию мощность 7,5 кВт; Газоснабжение – имеется возможность газификации земельного участка	4 500,00	900,00	2 634,08 + стоимость размещения в СМИ и на БУТБ
3	д. Подгатье, ул. Дачная,15; 624484006101000095	0,1577	Подъездные пути в песчано-гравийном исполнении; водопровод – сети водоснабжения отсутствуют; электроснабжение – техническая возможность подключения к сети ВЛ-0,4 кВт, разрешенная к использованию мощность 7,5 кВт; Газоснабжение – сети газоснабжения отсутствуют	7 000,00	1 400,00	2 297,70 + стоимость размещения в СМИ и на БУТБ
4	аг. Сергеевичи, ул. Советская, 36; 624484007701000373	0,1500	Имеются подъездные пути местного значения (асфальтовое покрытие). Имеется техническая возможность подключения к сетям электроснабжения (разрешенная к использованию мощность 6 кВт), водоснабжения	4 200,00	840,00	3 299,88 + стоимость размещения в СМИ и на БУТБ

Продавец:
По лотам 1, 2, 3:
Новополький сельский исполнительный комитет 222845, аг. Новополье, ул. Центральная, 21 Пуховичского района Минской области; исполняющий обязанности председателя Новополького сельисполкома Прохоров Алексей Александрович 80171330316, главный специалист управления землеустройства Пуховичского райисполкома Силяванчик Наталья Петровна, 80171392939.

Окончание приема заявлений на участие в торгах с прилагаемыми к ним документами – 09.07.2024, до 15.00.

Задаток для участия в торгах перечисляется на текущий (расчетный) банковский счет № BY60AKBB30120000066940000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». **Срок внесения задатка** – не позднее даты и времени окончания приема заявлений на участие в торгах. **Назначение платежа**: внесение суммы задатка для участия в электронных торгах рег. № ____ по заявлению № ____.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

Сроки возмещения затрат на организацию и проведение торгов:

Победитель электронных торгов (претендент на покупку) в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах торгов обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов, иные платежи, указанные в протоколе.

Сроки и условия заключения договора:

Не позднее 2 рабочих дней после представления копий платежных документов о возмещении вышеназванных затрат, иных платежей, указанных в протоколе о результатах торгов, а также внесения платы за земельный участок, продаваемый в частную собственность, или за право заключения договора аренды земельного участка, победитель электронных торгов (претендент на покупку) получает выписку из решения об изъятии земельного участка или заключает договор аренды земельного участка.

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов подлежат возмещению в порядке, предусмотренном в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь 1 апреля 2014 г. N 298 «Об утверждении положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен

НЕ ТОЛЬКІ ДЛЯ СМАКУ

Чым карысныя каенскі перац і карыца

У адным з папярэдніх нумароў мы расказалі пра сакрэты самай дарагой і карыснай у свеце прыправы — шафрану, а таксама пра спецыю, якая па сваіх уласцівасцях яму амаль не саступае, — куркуме. Яшчэ дзве прыправы, карысць якіх складана аспрэчыць, — каенскі перац і карыца. Іх ужыванне дапамагае палепшыць імунітэт і спыніць працэсы старэння, пазбавіцца ад высокага цэны і халестэрыну, папярэджвае сардэчна-сасудзістыя, ракавыя і іншыя захворванні. Аднак пры ўсіх карысных уласцівасцях гэтых спецый варта памятаць, што яны не з'яўляюцца лекамі і не могуць выкарыстоўвацца замест сучасных прэпаратаў. Пра загадкі прыпраў, вядомых са старажытнасці, расказвае нейрахірург, навуковы супрацоўнік аддзялення пухлін галаўнога мозгу РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчык кафедры неўралогіі і нейрахірургіі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя Беларускага дзяржаўнага медыцынскага універсітэта Гумен ГАРБАНІДЖАД.

— Доктар Гумен, адкуль да нас прыйшоў каенскі перац?

— Яго гісторыя налічвае амаль дзевяць тысяч гадоў. Калі радзіма ільнавых прыпраў — Азія і Усход, то ён паходзіць з Лацінскай Амерыкі. Калі англасаксы адкрылі Амерыку, яны бачылі, што мясцовыя жыхары дадаюць яго ў ежу, і яна становіцца крыху вострай і мае спецыфічны смак. Ацаніліся гэта, а пакольк і з даўніх часоў былі добрыя гандлярамі, забралі каенскі перац у Еўропу. У індзейцаў ён меў іншую назву — Kyynha, а каенскім перцам яго назвалі французы, якія завезлі са сваёй калоніі, французскай Гвінеі, што знаходзіцца побач з Бразіліяй. І такая назва ў Еўропе прыжылася.

— Як перцу ўдалося распаўсюдзіцца і прыжыцца на ўсёй планеце? Чаму нам падабаюцца вострыя стравы?

— Сапраўды, перац востры, ад яго цякуць слёзы, і для таго, каб мы яго ўжывалі, арганізм ідзе на хітрасць. Пакольк перац вельмі карысны, калі мы яго ўжываем, у нас выпрацоўваецца эндарфін (гармон шчасця), і мы адчуваем пачуццё радасці. Так арганізм узнагароджвае нас за тое, што мы прынялі такія пакуты. У амаратаў вострых страў больш выпрацоўваецца эндарфіну, і гэта прымушае іх есці такія стравы яшчэ і яшчэ. Тое ж самае адбываецца з амаратарамі экстрэмальнага спорту: эндарфін прымушае іх працягваць заняткі.

— У чым карысць каенскага перцу?

— У ім утрымліваецца рэчыва капсаіцын, якое і дае пякучы смак. І калі казаць пра сувязь гэтага рэчыва з нашым сэрцам, то гэта блізкія сябры. Капсаіцын станоўча ўплывае на каранарныя артэрыі. Вучоныя даказалі, што ў людзей, якія часта ўжываюць каенскі перац, прыкладна на 14 % змяншаецца верагоднасць інфаркту міякарда.

Каенскі перац таксама вельмі карысны для гіпертонікаў: добра зніжае цісk і такім чынам знімае нагрузку не толькі на сэрца, але і на ўсю сардэчна-сасудзістую сістэму. Гэта прыправа шырока выкарыстоўваецца ў краінах Афрыкі і Лацінскай Амерыкі, і колькасць інфаркту міякарда ў гэтых краінах істотна меншая.

Ён зніжае нагрузку на страўнік і паляпшае страваванне, а таксама мае антысептычныя ўласцівасці. Калі мы ўжываем не зусім свежую ежу, перац выратуе сітуацыю. Звычайна ў краінах, дзе спёка, у мяса дадаюць каенскі перац, бо там яно хутка псуецца, і такім чынам абараняюць страўнік ад атручвання.

Вельмі спрыяльна гэты перац уплывае на кішэчнік. У цяперашні час каенскі перац вучоны лічаць самым карысным з усіх вострых прадуктаў. Рэч у тым, што ён не раздражняе страўнікава-кішачны тракт, нават выкарыстоўваецца для лячэння некаторых захворванняў, у прыватнасці дыярэі, запораў і ўздуцця жывата. У некаторых краінах пры расстройствах страўніка яго растваралі ў вадзе і п'юць нашча. Аднак ёсць вялікае «але»: каенскі перац мае шмат падробак. І пад яго выглядам прадаюць іншыя вострыя перцы ці змешваюць яго з іншымі. І такая падробка, канешне, можа моцна раздражняць слізістую страўніка і, надвараг, выклікаць шмат праблем для стрававальнай сістэмы. Сапраўдны перац каен каля 10—25 см, тонкі, абавязкова чырвонага колеру. Таму калі і выкарыстоўваць вышэйзгаданыя прыёмы, то трэба быць упэўненымі, што каенскі перац сапраўдны. Акрамя таго, варта мець на ўвазе, што заўсёды ёсць індывідуальная непераноснасць.

Яшчэ адна ўласцівасць каенскага перцу — ён павышае тэмпературу цела. Калі ў халодны час года з раніцы выпіць у кашцы гарбаты шклянку разбаўленага ў вадзе перцу ці дадаць яго ў ежу, ён дапаможа сагрэцца і палепшыць імунітэт. Прыправа паскарае метабалізм, і ў арганізме спальваецца больш калорый. Каенскі перац — добры антыаксідант, хоць і не настолькі моцны, як шафран. У ім утрымліваецца бэта-каратын, які ў арганізме ператвараецца ў вітамін А, і забяспечвае яго патрэбу. Пакольк менавіта гэты вітамін працуе супраць ракавых клетак, таму і шмат што выкарыстоўваюць як лекі падчас прастудных хвароб. На Усходзе альтэрнатыўная медыцына прызначае яго для лячэння сінуситу (запалення пазух носа). Дастаткова растварыць яго ў шклянцы гарачай вады і выпіць маленькімі глыткамі.

Каенскі перац таксама выкарыстоўваецца для лячэння захворванняў апорна-рухальнага апарату. Індзейцы і іншыя старажытныя нацыі змешвалі яго з какосавым алеем і націралі суставы, якія баляць. Лічыцца, што такім чынам змяншаюцца болі пры артрозе і артрыце.

Гэты перац спрыяе росту валасоў. Пры іх выпадзенні ўсходнія жанчыны змешваюць алію-кавы алей з каенскім перцам і робяць маску на валасы на 30 хвілін. Лічыцца, што ён умацоўвае карані валасоў, робіць больш бліскучай іх структуру, паляпшае рост. Аднак і тут трэба быць упэўненымі, што перац сапраўдны, бо ад падробкі можна атрымаць апёк скуры галавы. У беларускай кухні каенскі перац, на жаль, не знайшоў шырокага распаўсюджання.

— Якая краіна лічыцца радзімай карыцы?

— Карыца — адно з самых рэдкіх і загадкавых дрэў нашай планеты, ніхто дакладна не ведае, адкуль яно паходзіць. У егіпецкіх манускрыптах, якім каля чатырох тысяч гадоў, напісана, што егіпцяне на той час былі знаёмы з гэтымі лекамі каля тысячагоддзя. Карыца ў іх выкарыстоўвалася ў якасці лекаў, але яны яе сакрэт схавалі, што вярбюды дадае загадкавасці гэтай прыправе. Састаў і тэхналогія, якія выкарыстоўвалі егіпцяне для муміфікацыі целаў, таксама не вядомы і вывучаюцца дагэтуль, але тое, што яны пахнуць карыцай, сведчыць, што яе выкарыстоўвалі ў гэтым працэсе.

Другая крыніца, дзе згадваецца гэтая прыправа, — старажытнаяўрэйскія свяшчэнныя кнігі. Там карыца таксама ўпамінаецца як лекі, але як іх выкарыстоўвалі, і адтуль дакладна невядома. А вось старажытныя рымляне прымянялі карыцу ў саставе араматызатараў. Арыстоцель пісаў, што насенне гэтага дрэва прынесла загадкавая птушка па імені cinnamon Logus. A Cinnamon у перакладзе з англійскай і ёсць карыца. Насамрэч увесь яе гістарычны шлях суправаджаецца тайнамі, загадкамі і міфалогіяй.

Карыца — адно з самых рэдкіх і загадкавых дрэў нашай планеты, ніхто дакладна не ведае, адкуль яно паходзіць. У егіпецкіх манускрыптах, якім каля чатырох тысяч гадоў, напісана, што егіпцяне на той час былі знаёмы з гэтымі лекамі каля тысячагоддзя. Карыца ў іх выкарыстоўвалася ў якасці лекаў, але яны яе сакрэт схавалі, што вярбюды дадае загадкавасці гэтай прыправе. Састаў і тэхналогія, якія выкарыстоўвалі егіпцяне для муміфікацыі целаў, таксама не вядомы і вывучаюцца дагэтуль, але тое, што яны пахнуць карыцай, сведчыць, што яе выкарыстоўвалі ў гэтым працэсе.

Але трэба сказаць, што з карыцай яшчэ ў часы старажытнага Рыма звязаны вялікія спекуляцыі. Прыправа вырабляецца з кары дрэва, якая хутка расце і лёгка збіраецца. Дэфіцыту карыцы ніколі не існавала, але, пакольк гэты бізнес знаходзіўся ў руках пэўных людзей, яны тым карысталіся. Як вядома, калі 90 % тавару знаходзіцца ў вашых руках, вы самі можаце вызначаць, колькі ён будзе каштаваць. У гэтым сэнсе карыцу можна параўнаць з алмазам, зусім не рэдкім каменем, але, пакольк бізнес засяроджаны ў руках абмежаванай колькасці людзей, яны і дыктуюць цэны.

Дык вось, у часы старажытнага Рыма, каб купіць 350 грамаў карыцы, рымляніну трэба было працаваць амаль чатыры гады. Тады гэтая прыправа выкарыстоўвалася толькі ў якасці лекаў. Каля 1500 гадоў таму ў Азіі людзі зразумелі, што карыца — выдатная прыправа, з дапамогай якой атрымліваюцца дахмяныя стравы.

Карыца станавілася і прычынай войнаў, якія працягваліся некалькі стагоддзяў. У XV стагоддзі партугальцы прыйшлі ў Шры-Ланку і зняволілі мясцовых жыхароў, каб выкарыстоўваць іх працу для вырошчвання карыцы. Дарэчы, да гэтага часу самай яскаснай і духмянай карыцай лічыцца шрыланкійская. Так пачалося зняволенне шрыланкійцаў партугальцамі, і яны жорстка эксплуатавалі мясцовых жыхароў, каб тыя вырошчвалі карыцу. Трэба сказаць, што вытворчасць карыцы была дастаткова таннай. Аднак, пакольк партугальцы былі манапалістамі ў экспарце, яны стваралі штучны дэфіцыт, і кошт спецыі быў вельмі высокі, дазволіць сабе яе маглі толькі багатыя людзі.

Хутка англасаксы зразумелі, што гэта вельмі выгадны бізнес, і пачалася вайна за рынак карыцы. Партугальцы доўга супрацьлягаліся і не саступалі гэтую тэрыторыю са сваімі рабамі. Затым галандцы перамаглі партугальцаў і захапілі Шры-Ланку. Вытворчасць карыцы траплена ў іх рукі, а эканоміка гэтай краіны моцна залежала ад гандлю прыправаі. У рэшце рэшт кропку паставілі англічане: яны захапілі Шры-Ланку, і гэта стаў іх бізнес.

Яшчэ адной звышдзяржавай у той час была Францыя, якая мела шмат калоній. Заместтаго, каб вайваць з англічанамі, яны вырашылі праблему па-іншаму: таемна накіравалі вядомага батаніка П'ера Пойва (Pierre Poiv) у Шры-Ланку, каб ён адабраў якаснае насенне дрэў карыцы. Яму гэта ўдалося, і насенне было пасеяна на тэрыторыі адной з французскіх калоній, на астравах у Карыбскім моры. Тыды прывезлі афрыканскіх рабоў і з іх дапамогай пачалі таннавырабляць карыцу. Пасля гэтага прыправа стала больш таннай і яе маглі атрымаць многія. А галандцы неслі вялікія страты ад таннай французскай карыцы. Да цяперашняга часу Францыя выкарыстоўвае танную афрыканскую рабочую сілу для развіцця сваёй краіны. Як сказала прэм'ер-міністр Італіі Джоржа Мелані, не трэба змагацца з эміграцыяй афрыканцаў у Еўропу, а трэба вызваляць Афрыку ад Францыі.

Цяпер адну чвэрць аб'ёму сусветнага рынку карыцы выпрабляе Інданезія, затым ідуць В'етнам і Кітай, на чацвёртым месцы — Шры-Ланка, якая робіць самую якасную карыцу ў свеце. Карыстаючыся гэтым, іншыя вытворцы прадаюць свой тавар як тавар са Шры-Ланкі ці змешваюць карыцу нізкага сорту з невялікай колькасцю карыцы са Шры-Ланкі, каб зрабіць яе больш духмянай.

— Як адрозніць падробку? У чым карысць карыцы?

— Часта замест натуральнай карыцы прадаюць касію, другая назва якой «інданезійская карыца». Яе вырабляюць у Інданезіі і Кітаі. Гэта высушаная кара іншага віду карычнага дрэва. Касія мае іншыя ўласцівасці. Праверыць сапраўднасць карыцы можна пры дапамозе ёду. Яго трэба капнуць на невялікую колькасць набытай спецыі. Парашок сапраўднай карыцы амаль не зменіць свой колер, а парашок спецыі з кары касіі набудзе цёмна-сіняе адценне.

Карыца з'яўляецца моцным антыаксідантам, яна знішчае свабодныя радыкалы і змяншае працэсы старэння, стымулюе імунную сістэму, работу лейкацытаў, робіць іх больш рухомымі. Ужываць карыцу рэкамендуецца людзям з цукровым дыябетам, бо яна натуральным шляхам зніжае цукар у крыві. Карыца змяншае колькасць дрэннага халестэрыну, падтрымлівае нашы сасуды ў чыстым выглядзе. Дапамагае пры страваванні, калі ежа доўга застаецца ў страўніку і дрэнна ператраўліваецца.

Алена КРАВЕЦ.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Вам неабходна засяродзіцца на самай важнай справе ў дадзены момант. Прыдзецца адстойваць свае інтарэсы. Рэальна разлічвайце сілы, паспрабуйце вырашаць толькі тыя праблемы на працы, якія залежаць ад вас, а не браць на сябе чужыя праекты. Пятніца — цудоўны дзень для рэалізацыі творчых планаў, але не варта пакуль дзяліцца сваімі задумамі з начальствам, яно можа не зразумець вашы ідэі.

ЦЯЛЕЦ. На гэтым тыдні пажадана сувымяраць сілы і не стварацьперагрузкі на работе. Звярніце ўвагу на знешні выгляд: па адзенні сустракаюць. У сераду сустрэча са старым сябрам, якую вы даўно адкладалі, нарэшце адбудзецца і прынясе нямала прыемных хвілін. У пятніцу, вядома, ад'ектыўных цяжкасцяў не пазбегнуць, але вам будзе пад сілу вырашэнне бягучых задач і жыццёвых праблем.

БЛІЗНЯТЫ. На гэтым тыдні ўпэўненасць ва ўласных сілах і аптымізм дапамогуць заваяваць добразычлівасць навакольных і ўмацаваць добрыя адносіны з начальствам. Самымі спрыяльнымі днямі тыдня абяцаюць быць серада і пятніца. На работе і ў асабістым жыцці чакаецца светлая паласа і прыемныя неспадзеўкі. Захоўвайце душэўную раўнавагу і пазітыўны настрой.

РАК. Паспрабуйце не вельмі вымхвалацца сваімі магчымасцямі і добрымі якасцямі — бываюць моманты, калі сціпласць таксама становіцца ўпрыгожваннем. Чым больш альтруізму і падтрымкі вы праявіце ў адносінах да навакольных, тым больш пазітыўнымі будуць перамены ў вашым жыцці. Можна чакаць новых праектаў і прапаноў. Ваша асноўная сіла будзе заключацца ў арганізатарскіх здольнасцях.

ЛЕЎ. Пачатак тыдня будзе ўдалы практычна ва ўсіх адносінах. Пажадана аб'ектыўна ацаніць свае магчымасці і размеркаваць час і сілы, каб работа не займала амаль увесь час. У асабістым жыцці могуць напаткаць ілюзіі і спакушэнні. У другой палове тыдня лепш стрымліваць эмоцыі, каб пазбегнуць непатрэбных праблем. У суботу запрасіце сяброў, зрабіце пікнік.

ДЗЕВА. Не выключана, што падзеі тыдня будуць садзейнічаць вашаму прафесійнаму росту. Паспрабуйце менш увагі звяртаць на крытыку — паспяховае прасоўванне па кар'ернай лесвіцы будзе залежаць толькі ад вас. Зможаце ўмела абысці сеткі інтрыг, расстаўленыя кімсьці з калег, і праявіць свае таленты.

ШАЛІ. Будзьце абачлівыя, сачыце за сваімі словамі. Калі вы ў адпачынку, то будзьце расслабленыя і задаволеныя жыццём. У асабістым жыцці чакайце прыемных і нечаканых змен.

СКАРПІЁН. Тыдзень можа парадаваць шматлікімі падзеямі і ўражаннямі, таму трэба выкарыстоўваць кожнае імгненне і пражываць іх гарманічна і ярка. Вас чакае поспех, а непрыемнасці абыдуць бокам. Знайшоўшы кампраміс, вы наладзіце свае ўзаемаадносіны з дзелавымі партнёрамі. У асабістым жыцці чакае нямала прыемных хвілін і гарачых спатканняў.

СТРАЛЕЦ. Запланаваная на пачатак тыдня паездка можа сарвацца, але не варта перажываць з гэтай нагоды, вы наўрад ці шмат страціце. У панядзелак верагоднаясур'ёзная дзелавая сустрэча з чалавекам здалёк. За гэты тыдзень можаце справіцца з многімі праблемамі і праявіць актыўнасць у выражэнні сваіх спраў. Не прымушайце сябе чакаць.

КАЗЯРОГ. Галоўнае — быць актыўнымі і паслядоўнымі на працягу ўсяго тыдня. Непажадана абяцаць залатыя горы. У сераду можа прыйсці цікавая інфармацыя, прыміце яе да ўвагі. Вашы рэальныя магчымасці могуць праяснічца толькі да канца тыдня. Вам будуць на рэдкасць добра ўдавацца справы, звязаныя з добраўпарадкаваннем дома. У суботу магчыма фінансавая дапамога ад сваякоў.

ВАДАЛІЙ. Будзьце абачлівыя, трымайце сябе ў руках, і тады не прыйдзецца раскайвацца ў сваіх учынках. Паспрабуйце не траплящца на вуду ілюзіям, і ваша паспяховасць узрасце. У чацвер верагодныя ўдалыя дзелавыя сустрэчы. У вас будзе спрыяльная сітуацыя на рабоце. А вось у асабістым жыцці адносіны пагражаюць заблытацца, што можа трывожыць вас.

РЫБЫ. Вы адчуеце прыліў сіл і будзеце ў выдатнай форме, аднак расслабляцца не варта. Даверце частку спраў надзейным партнёрам, за сабой жа пакіньце самае галоўнае. Пастарайцеся абяцаць толькі тое, што зможаце выканаць. У выхадныя дзецям спатрэбіцца ваша ўвага і клопат.

8 ЧЭРВЕНЯ Даты Падзеі Людзі

У краіне

1895 год — нарадзіўся (в. Погіры, Слонімскі павет) Ігнат Дварчанін, грамадскі дзеяч беларускага нацыянальна-дэмакратычнага адраджэння, вучоны, паэт, пісьменнік, літаратуразнавец, доктар філасофіі. Пераклаў на беларускую мову паэму Аляксандра Блока «Дванаццаць», склаў і выдаў у 1927 годзе «Хрэстаматыю новай беларускай літаратуры». З 1927 года супрацоўнічаў з заходнебеларускімі часопісамі «Родныя гоні», «Маланка». У 1930-м арыштаваны польскімі ўладамі і асуджаны на працэсе на справе беларускага клуба «Змаганне» на восем гадоў турмы. Вызвалены 1932-м у выніку абмену палітвязнямі паміж СССР і Польшчай. Працаваў у АН БССР у камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі і КП(б)ЗБ. Выконваў абавязкі дырэктара Інстытута мовазнаўства.

1934 год — у Мінску пачаў сваю работу 1-ы з'езд пісьменнікаў БССР, на якім быў створаны Саюз савецкіх пісьменнікаў Беларусі.

1967 год — у Мікалаеўшчыне (Стаўбцоўскі раён) адкрыўся філіял літаратурнага музея Якуба Коласа, які аб'ядноўвае мемарыяльныя сядзібы Акінчыцы, Ласток, Альбуць, Смольня. Тут распрацаваны шэраг аглядных і тэматычных экскурсій па сядзібах філіяла, праводзяцца тэатралізаваныя экскурсіі, музейна-педагагічныя заняткі, выставы, творчыя сустрэчы з вядомымі людзьмі, літаратурна-музычныя святы.

У свеце

1783 год — вулкан Лакі ў Ісланды пачаў сваё васьмімесячнае вывяржэнне, якое аказалася самым буйным лававым вывяржэннем у гісторыі. Загінула каля 10 тысяч чалавек (20 % насельніцтва Ісландыі). Перыяд пасля вывяржэння вядомы як «бедствы ў тумане».

1824 год — Ноа Кашынг з Квебека запатэнтаваў пральную машыну.

У той жа дзень, але ў **1869 годзе** Айвз Макгафі з Чыкага запатэнтаваў пыласос.

Так гаварыў...

МАКСІМ ГОРКІ:

«Каля дастойнага чалавека патрэшся, як медная капейка аб серабро, і сам потым як рубель выглядаць будзеш».

СЁННЯ

Месяц

Маладзік 6 чэрвеня.

Месяц у сузор'і Дзевы.

Сонца	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.39	21.39	17.00
Віцебск —	4.21	21.37	17.16
Магілёў —	4.29	21.29	17.00
Гомель —	4.35	21.16	16.41
Гродна —	4.56	21.52	16.56
Брэст —	5.06	21.44	16.38

Імяніны

Пр. *Алены, Аверкія, Георгія, Івана, Карпа, Макара.*

К. *Ады, Ядвігі, Вільгельма, Максіма, Медарда, Севярына.*



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Пры знаёмстве задавайце пытанні ў парадку значнасці. Напрыклад, калі чалавек не любіць алкаголь, то, хутчэй за ўсё, вам і не трэба ведаць яго імя.

Кажуць, што для шчаслівага сямейнага жыцця трэба заплюшчваць вочы на недахопы адно аднаго...

Важнае пытанне: а калі вочы можна расплюшчваць?

— Дачушка, каго ты больш за ўсё любіш?
— Бульбачку і гарбату.
— А з людзей?
— А людзей я не ем.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА. ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРПЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар.

Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 3820000007667 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 10.644. Індэкс 63850. Зак. № 1356.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 7 чэрвеня 2024 года.